УДК 37.016:811.161

# ПАД “ЧУЖЫМ НЕБАМ”: ЧАЛАВЕК І ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ У АНТЫВАЕННЫХ РАМАНАХ Я. БРЫЛЯ, Б. САЧАНКІ І М. АЎРАМЧЫКА

**Лугоўскі Аляксандр Іванавіч**
дацэнт кафедры беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”;
кандыдат педагагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

*Ключавыя словы: вайна, абставіны, выгнанне, палон, чужына, фашызм, змаганне, выбар, Радзіма, маці, чалавечнасць, мужнасць, літаратура, наватарства, кантэкст, антываенны раман.*

*Змест артыкула складае параўнальны аналіз антываенных твораў Я. Брыля, Б. Сачанкі і М. Аўрамчыка. Аўтар засяроджвае ўвагу на праблеме вернасці маральным ідэалам людзей, трапіўшых у нечалавечыя ўмовы фашысцкай няволі падчас Другой сусветнай вайны.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Раман Янкі Брыля “Птушкі і гнёзды” (1964) быў новай старонкай ў гісторыі беларускай літаратуры. Ніхто з савецкіх пісьменнікаў раней не пісаў пра жыццё ў фашысцкай Германіі да нападзення яе на СССР. Наватарства твора і ў тым, што ўсе падзеі перадаюцца праз светаўспрыманне палоннага Алеся Руневіча, сялянскага хлопца з Заходняй Беларусі, былога польскага салдата, які трапіў у самы цэнтр нацысцкага логава.

На вобразе Алеся Руневіча ў рамане раскрываюцца такія агульначалавечыя праблемы, як чалавек і радзіма, чалавек і абставіны, чалавек і вайна, вайна і мір. З першых дзён у палоне Алесь пачынае свой нялёгкі шлях “да святла”. Інтэлігент у душы, ён увесь час думае, аналізуе, супастаўляе, шукае сваё месца і адначасова імкнецца дакапацца да каранёў фашызму, яго сутнасці і прыроды.

Фашызм паказаны ў рамане ў розных абліччах. Перад вачыма Руневіча паўстае цэлая галерэя разбэшчаных фашысцкай прапагандай абывацеляў. Адурманеныя прамовамі Гебельса, гэтыя часам далёкія ад палітыкі людзі спачатку нясмела, а потым усё нахабней пачыналі прымяраць да сябе права “арыйцаў” распараджацца лёсам іншых народаў. Руневіч не аднойчы заўважаў, што ідэі нацысцкай звышчалавечнасці асабліва згубна ўплывалі на моладзь (Курт Камрат, Марыхен). За час палону герой Янкі Брыля не збяднеў душою, не страціў здольнасці разбірацца ў людзях. Ён перакананы, што не ўсе немцы ворагі: “Як шмат людзей і тут, у Германіі, <…> робяць не тое, што яны хацелі б!..” [2, с. 140]. Герой Янкі Брыля не зламаўся і з годнасцю прайшоў цярністы, даўжынёю ў два гады шлях палоннага, бо быў ”увесь і заўсёды, як магнітная стрэлка, накіраваны туды, дзе яго народ” [1, с. 579].

Кампазіцыйна раман пабудаваны так, што аповед пра жыццё галоўнага героя ў фашысцкім палоне пастаянна перапыняецца яго ўспамінамі пра родную Беларусь. Паняцце пра Радзіму ў Алеся Руневіча шматзначнае. Гэта найперш родная вёска, краявіды якой не адзін раз, як пратэст супраць няволі, усплываюць у памяці палоннага. Радзіма для Алеся – гэта і кнігі. . У палоне яму найчасцей ўспамінаецца Леў Талстой са сваёй любоўю да жыцця, да мудрай прастаты і простага, беднага чалавека, да цяжкай сумленнай працы.

Шмат думае Руневіч пра маці. То ўяўляе яе бледную, з высушаным ад хваробы тварам, то бачыць з сярпом у руках, добрую, ласкавую, а іншы раз і злосную, бязлітасную ў працы. Часцей успамінаюцца мацярынскія слёзы. Вобразы няшчаснай жанчыны-маці і шматпакутнай Беларусі ў рамане зліваюцца ў адно цэлае, і таму як зварот да іх абедзвюх успрымаюцца Алесевы словы: “Я прыйду, дарагая, я ўсё ж такі калі-небудзь прыйду!.. І ўсё зраблю тады, каб ты адпачыла ад слёз, ад пакутаў сваіх, ад беспрасветнай працы для нас, для зямлі” [2, с. 150].

Шмат думае і Іван Гарапашка, герой рамана Б. Сачанкі “Чужое неба. Вузлы памяці” (1975), сям’я якога была гвалтоўна вывезена ў фашысц-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

кую Германію. Калі ў рамане Я. Брыля "Птушкі і гнёзды" ўспаміны падтрымліваюць галоўнага героя, надаюць яму духоўныя і фізічныя сілы, то думкі і мудрасць Івана Гарапашкі накіраваны на тое, каб выжыць разам з сям'ёй нават у няволі. Ды не як-небудзь, а трэба жыць па-свойму, "трывала стаяць на сваёй жыццёвай лініі" [3, с. 233].

Лірычныя замалёўкі роднай прыроды ў "Чужым небе" сімвалізуюць той жа вобраз радзімы, яе прыгажосць і непаўторнасць. Асабліва выразна адчуваюць героі гэтую прыгажосць удалечыні ад дома: "Як часта сніў я яго, гэты лужок, на чужыне, у Нямеччыне! Прахаплюся ўночы і – аж у грудзях захаладае. Так хочацца пабыць мне дома, на радзіме, у вёсцы, там, дзе ў канцы гародаў зелянеў, пярэсцеў ад красак штолета роўны-роўны, як стол, лужок" [3, с. 207].

Як і для Алеся Руневіча, для героя-апавядальніка Сымона, сына Івана Гарапашкі вайна стала асабістай драмай, што наклала адбітак на яго светаўспрыманне і светаразуменне. Толькі прайшоўшы праз усе ступені фашысцкага пекла, Алесь Руневіч і Сымон Гарапашка змаглі падняцца да найвышэйшага разумення Чалавека і Чалавечнасці на зямлі, да бязмежнай любові да роднага краю, роднай прыроды, якая ўлівае ў іх новыя жыццёвыя сілы, новы зарад энергіі. Родны дом, родная прырода – гэта як бы невычэрпная крыніца жыццёвай сілы, прысутнасць якой проста неабходная для іх.

Адзначым і тое, што тэма Радзімы, тэма жыцця як найвялікшай каштоўнасці Б. Сачанкам і Я. Брылём раскрываюцца па-рознаму. На думку Я. Брыля, жыццё не мае патрэбы ва ўзнёслым, паэтычным апавяданні. Пра паэзію жыцця, пра любоў да Радзімы гаварыць трэба шчырымі словамі, пазбягаючы знарочыстай паэтыкі і празмернай узнёсласці.

Б. Сачанка ў сваю чаргу, ствараючы ўзнёслую песню роднаму кутку і той навакольнай прыгажосці, якая, на яго думку, дапамагае чалавеку стаць чалавечным, шырока карыстаецца і ўзнёслай лексікай, і ўрачыстай інтанацыяй.

Заяўленая Я. Брылём у рамане "Птушкі і гнёзды" тэма радзімы ў выгнанні гучыць лейтматывам у антываенных творах М. Аўрамчыка.

М. Арамчык з'яўляецца прадстаўніком франтавога пакалення, на чый лёс моцна паўплывала вайна. Пісьменнік каля трох гадоў знаходзіўся ў палоне, пра што доўгі час пісаць не мог. Перажытае за гады вайны, аднак, не магло не аказаць уплыву на кірунак літаратурнай творчасці пісьменніка пасляваенных дзесяцігоддзяў. Змест празаічных твораў М. Аўрамчыка складаюць уражанні ваенных гадоў, калі ён быў яшчэ зусім юнаком, якому было наканавана зведаць жорсткі лёс ваеннапалоннага, неаднойчы бываць на мяжы жыцця і смерці, выжыць, каб ужо ў сталым узросце адкрыць грамадству праўду пра фашысцкі палон (раман "У падзямеллі", 1986 і аповесць "Палон", 1989).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У аснову рамана "У падзямеллі" і аповесці "Палон", у якіх М. Аўрамчык сутыкнуў два светы – гуманізм і антычалавечнасць, – пакладзена перажытае аўтарам у фашысцкім палоне.

У рамане "У падзямеллі" пісьменнік паказаў свайго героя натуральна, без залішняга прыхарошвання. Яго герой шмат чым нагадвае Алеся Руневічва. Гэта беларускі хлопец Янка Лагун, які за калючым дротам зведаў голад, ганьбу, прыкрасць, пакуты і тугу па радзіме.

Выстаяць у цяжкіх умовах палону і працы на шахце Рура Янку дапамагае салідарнасць рабочых розных нацыянальнасцей. Усе яны з'яўляюцца ахвярамі фашысцкай навалы. Аўтар паказвае ў рамане самаахвярнасць і мужнасць нявольнікаў, перад якімі вострa стаяла праблема выбару і тым самым добраахвотна выбіралі смерць.

Дакладна, амаль дакументальна, апісвае М. Аўрамчык у аповесці "Палон" знаходжанне вязняў у перасыльных канцлагерах. Галоўны герой – Міхась Сіліч – увесь час горнецца да блізкіх па духу яму людзей (Леанід і Багдан Платонавіч з Украіны), што дапамагло яму не зламацца і не страціць чалавечую годнасць.

Узгаданыя творы антываеннай накіраванасці Я. Брыля, Б. Сачанкі і М. Аўрамчыка займаюць сваё адметнае месца ў беларускай літаратуры, яны прасякнуты глыбокім роздумам над праблемамі гуманізму і чалавечнасці, над трагічным лёсам беларусаў і іншых еўрапейскіх народаў падчас Другой сусветнай вайны.

**Літаратура**


1. Адамовіч, А. Здалёк і зблізку / А. Адамовіч. – Мінск : Маст. літ., 1976. – 624 с.
2. Брыль, Я. Збор твораў : у 5 т. – Т. 3 / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 528 с.
3. Сачанка, Б. Чужое неба. Вузлы памяці / Б. Сачанка, – Мінск : Маст. літ., 1975. – 352 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова